Рэутовіч Я.М.,
канд.пед.навук,
дацэнт

# УДАСКАНАЛЬВАННЕ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ ХАРАВЫХ ТВОРАЎ

Вядома, што курс харавой аранжыроўкі складаецца з дзвюх тэматычных частак: пераклад харавых партытур і стварэнне новых для розных тыпаў і відаў хароў на падставе аднагалосных песень альбо рамансаў з акампанементам. Дзеля гэтага ў працэсе навучання студэнты павінны паслядоўна набываць неабходныя веды ў галіне музычна-тэарэтычных і хоразнаўчых дысцыплін, добра ведаць кампаненты музычнай фактуры, вывучаць сродкі мастацкай выразнасці і віды харавога выканання.

Трэба мець на ўвазе, што калі першая частка харавой аранжыроўкі -- пераклад харавых партытур -- з'яўляецца амаль чыста тэхнічнай, то другая ж частка -- стварэнне харавых партытур -- патрабуе ад студэнтаў асабістай творчай работы. Менавіта яна садзейнічае развіццю творчай фантазіі, выяўленню мастацкай індывідуальнасці студэнтаў, дае ім магчымасць удасканальваць свае прафесійныя веды, здольнасці і навыкі.

Аналіз хормайстарскай дзейнасці выхаванцаў кафедры харавога мастацтва красамоўна сведчыць, што лепшыя творчыя дасягненні належаць тым, хто дасканала валодае тэхнікай аранжыроўкі і стварае партытуры з усебаковым улікам выканальніцкіх магчымасцей сваіх творчых калектываў. Гэта заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь Лявон Воўчак, кіраўнікі ўзорных хароў Антон Літоўка, Уладзімір Ліпскі, Наталля Баяльская, Уладзімір Комар, Алесь Лях і інш.

На жаль, у сённяшні час выкладанне харавой аранжыроўкі ва універсітэце культуры ажыццяўляецца без уліку гэтага вельмі значнага патрабавання часу. Менавіта таму мы не маем магчымасці прывесці прыклады выканання нашымі харавымі і вакальнымі калектывамі апрацоўкі ці аранжыроўкі, зробленай студэнтамі. Гэта тым больш не зразумела, бо на кафедры ў якасці выкладчыкаў аранжыроўкі працуюць два прафесійных кампазітары.

На наш погляд, каб пазбавіцца ад названых вельмі значных недахопаў і ўдасканаліць методыку выкладання гэтай дысцыпліны, неабходна ажыццявіць наступнае:

1) пераглядзець навучальныя планы і праграмы па ўказанай дысцыпліне з улікам пашырэння яе творчай часткі -- стварэнне новых харавых партытур;

2) распрацаваць метадычны дапаможнік па творчай частцы харавой аранжыроўкі на прыкладах беларускага рэпертуару;

3) аднавіць нотныя прыклады з метадычнымі ўказаннямі па харавой аранжыроўцы, складзеныя Корсакам Н.Ф. у 1983 г.;

4) штогод праводзіць конкурсы на лепшую студэнцкую аранжыроўку, апрацоўку, пераклад, кампазіцыю;

5) з мэтай заахвочвання студэнтаў лепшыя творчыя работы ўключаць у рэпертуар харавых калектываў і ансамбляў кафедры.

Актывізацыі творчай работы і развіццю прафесійных здольнасцей студэнтаў, на наш погляд, будзе садзейнічаць арганізацыя індывідуальных заняткаў па аранжыроўцы двойчы на тыдзень па 0,5 гадзіны замест заняткаў адзін раз, але па гадзіне.

Гэту прапанову, нам здаецца, трэба праэксперыментаваць спачатку з невялікай групай студэнтаў старэйшых курсаў.

Ярохіна С.К.,
дацэнт

# АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТА-ХОРМАЙСТРА НАД ВАКАЛЬНА-СІМФАНІЧНЫМ РЭПЕРТУАРАМ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ

Адметнай рысай дырыжорскай дзейнасці як прафесійнай, так і самадзейнай з'яўляецца работа над харавым творам без удзелу свайго "інструмента" -- хору. Таму ў практыцы харавога выканання ўсталявалася некаторая перыядычнасць творчага працэсу асваення партытуры.

Мы прапануем агульныя метадычныя палажэнні, якія дапамогуць арганізаваць студэнту-хормайстру сваю самастойную работу на прыкладах буйных кантатных твораў беларус-

кіх кампазітараў. Гэтыя палажэнні цесна звязаны з этапамі працэсу творчага вывучэння вакальна-сімфанічнага твора. Умоўна ў гэтым працэсе можна вылучыць чатыры этапы.

1. Агульны агляд твора і выяўленне мэты самастойнай работы.

2. Паглыбленае вывучэнне зместу і формы твора.

3. Пісьмовы аналіз твора.

4. Дырыжорскае асваенне партытуры.

На кожным этапе робіцца акцэнт на пэўныя бакі творчай дзейнасці.

Спынімся на характарыстыцы кожнага этапа самастойнай работы студэнта.

На першым этапе разглядаюцца пытанні выхавання слыхавога вопыту і навыкаў, неабходных для азнаямлення з сучаснымі творамі. Знаёмая форма вывучэння нотнага матэрыялу на фартэпіяна не заўсёды магчыма з-за складанасці прыёмаў кампазітарскага пісьма. У гэтым выпадку дапаможа дырыжору ўменне інтанаваць музыку "пра сябе", прачытваючы нотны тэкст па "вертыкалі" і "гарызанталі". Вялікую дапамогу аказвае праслухоўванне вакальна-сімфанічнага твора ў жывым выкананні або ў грамзапісу.

На другім этапе вывучэння вакальна-сімфанічнага твора студэнтам неабходна засяродзіць сваю ўвагу на прапяванні харавых галасоў і акордаў, не падыгрываючы сабе на фартэпіяна. Можна выкарыстаць метраном. Акрамя спеваў, неабходна фрагментарная ігра найбольш складаных месцаў партытуры, асобных гарманічных сугуччаў, кадэнцый і г.д. Усе гэта дапаможа запомніць партытуру і дасць магчымасць запісаць яе па памяці.

Трэці раздзел прысвечаны пісьмоваму аналізу твора. Ён уключае гісторыка-эстэтычны, тэарэтычны і вакальна-харавы падраздзелы.

У якасці прыкладу можна выкарыстаць кантату А.Багатырова "Беларускія песні". Адначасова з музычным вывучэннем твора неабходна прачытаць усю метадычную літаратуру, рэкамендаваную настаўнікам. Акрамя пад-ручнікаў, карысна пачытаць успаміны вучняў, сяброў, знакамітых дзеячаў культуры аб кампазітары і яго творчасці.

Чацверты этап звязаны з дырыжорскім асваеннем партытуры. Асноўная мэта яго -- перадаць глыбокі музычны змест твора з дапамогай дырыжорскага жэста і ўсёй палітры дырыжорскай тэхнікі.

Маеўская В.П.,
дацэнт

## АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА РАЗДЗЕЛУ "МЕТОДЫКА РАБОТЫ З ДЗІЦЯЧЫМ ХОРАМ" У КУРСЕ "ГІСТОРЫЯ І ТЭОРЫЯ ХОРАЗНАЎСТВА"

Пераход да шматузроўневай сістэмы вышэйшай адукацыі прадугледжвае сур'ёзную перабудову вучэбнага працэсу, перагляд яго зместу, планаў і праграм. Узнікаюць новыя патрабаванні да адбору матэрыялаў, у іх ліку насычанасць праграм сучасным зместам. Патрабуюцца і інавацыйныя формы навучання, якія павінны садзейнічаць умацненню прафесійных напрамкаў і ўзбраенню выпускнікоў універсітэта шырокім спектрам навыкаў і уменняў, патрэбных у будучай штодзённай практыцы.

Авалоданне глыбокімі прафесійнымі ведамі прадугледжвае развіццё ў студэнтаў даследчых навыкаў, здольнасці арыентавацца ў выбраных накірунках, высокага ўзроўню пазнавальнай дзейнасці. Вырашэнне дадзеных задач магчыма толькі пры індывідуальным падыходзе да кожнага студэнта. У гэтым выпадку вялікі акцэнт неабходна зрабіць на арганізацыю самастойнай работы, што дае магчымасць, пры наяўнасці агульнай праграмы курса, дыферэнцыравана падводзіць студэнта да канчатковага выніку ў справе авалодання ведамі.

Сучасны спецыяліст павінен умець самастойна набываць веды. Галоўную задачу вышэйшай навучальнай установы -- навучыць вучыцца -- неабходна рэалізоўваць прадумана і мэтанакіравана, садзейнічаць праяўленню творчага пачатку, патрэбнасці ў самаарганізацыі і самадысцыпліне.

Раздзел "Методыка работы з дзіцячым хорам" уваходзіць у курс "Гісторыя і тэорыя харавога мастацтва". З улікам таго, што нашы выпускнікі ў апошні час пачалі працаваць кіраўнікамі аматарскіх хароў і ансамбляў і займацца арганізацыяй вольнага часу дзяцей, кафедра харавога мастацтва пры пераглядзе зместу курса палічыла мэтазгодным павялічыць колькасць гадзін на вывучэнне гэтага раздзела і перагледзець яго напаўняльнасць па зместу.

Падрыхтаваная праграма ў наступным годзе, з пераходам на шматузроўневую сістэму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ